ПРАКТЫЧНАЕ КІРАЎНІЦТВА

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ)

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БАРАНАВІЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ)

**Практычнае кіраўніцтва
для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей,
педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі**

Баранавічы
РВА БарДУ
2013

УДК 37(078)
ББЛ 74.1я73
П20

Складальнікі:

*С. В. Кандрацюк, І. С. Маруцік*

Рэцэнзенты:

*Т. М. Пучынская*, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры філалогіі БарДУ;
*Н. Ф. Захарчэня*, выкладчык кафедры дашкольнай адукацыі БарДУ

П20 **Патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту : (З вопыту работы)** [Тэкст] : практ. кіраўн. для студэнтаў пед. спецыяльнасцей, педагогаў устаноў дашк. адукацыі / склад.: С. В. Кандрацюк, І. С. Маруцік. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2013. — 53, [7] с. — 65 экз.

Прадстаўлены тэарэтычныя асновы патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту, а таксама вопыт работы ўстановы дашкольнай адукацыі «Гарадзішчанскі яслі-сад» Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці па арганізацыі дадзенай дзейнасці ў рамках інавацыйнага праекту «Укараненне каштоўнасна-нарматыўнай мадэлі прафесійнай дзейнасці выхавацеля ўстановы дашкольнай адукацыі».

Выданне прызначана студэнтам спецыяльнасцей «Дашкольная адукацыя», «Дашкольная адукацыя. Практычная псіхалогія», педагогам устаноў дашкольнай адукацыі.

УДК 37(078)
ББЛ 74.1я73

© Складальнікі: Кандрацюк С. В., Маруцік І. С., 2013
© БарДУ, 2013

## *Чытачу*

Кіраўніцтва складаецца з двух раздзелаў, якія ўключаюць тэарэтычныя і практычныя матэрыялы па патрыятычным выхаванні дашкольнікаў.

У першым раздзеле прадстаўлена інфармацыя аб змесце, задачах, метадычных прынцыпах патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту.

Другі раздзел адлюстроўвае вопыт работы творчай групы педагагічнага калектыву ўстановы дашкольнай адукацыі «Гарадзішчанскі яслі-сад» Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці па фарміраванню патрыятычных пачуццяў дзяцей дашкольнага ўзросту. Шырока прадстаўлены накірункі, якія рэалізуюцца педагогамі ў адукацыйным працэсе, сцэнарыі свят.

Спадзяёмся, што выданне будзе добрым дапаможнікам пры фарміраванні патрыятычнай свядомасці дзяцей дашкольнага ўзросту.

*С. В. Кандрацюк, І. С. Маруцік*

## *Уводзіны*

Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці дашкольнай адукацыі аб'яднаны адным значным крытэрыем — яе якасцю, якая непасрэдна залежыць ад прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў. Прафесійнае развіццё педагога ўстановы дашкольнай адукацыі — гэта доўгі працэс, мэтай якога з'яўляецца фарміраванне чалавека як майстра сваёй справы. Прафесійная кампетэнтнасць сучаснага педагога з'яўляецца ўмовай эфектыўнай арганізацыі працэсу адукацыі і акрэсліваецца сукупнасцю агульначалавечых і спецыфічных прафесійных установак, якія дазваляюць рашаць прафесійныя задачы развіцця асобы дзіцяці. Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці выхавацеля ўстановы дашкольнай адукацыі ў каштоўнасна-нарматыўнай мадэлі прафесійнай дзейнасці рэалізуецца праз удасканаленне наступных кампетэнцый: каштоўнасна-сэнсавай, кагнітыўнай, дзейнаснай, камунікатыўнай, асобаснага самаўдасканалення.

Патрыятычнае выхаванне — адзін з бакоў маральнага выхавання. Ва ўмовах мэтанакіраванага педагагічнага суправаджэння працэс фарміравання патрыятычных пачуццяў дзяцей дашкольнага ўзросту становіцца сродкам выхавання жыццёва важных асобасных якасцей.

Удасканаленне прафесійных кампетэнцый выхавацеляў садзейнічае больш паспяховаму ажыццяўленню працэса патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту. Стрыжнем дадзенай кампетэнцыі выступаюць каштоўнасныя адносіны да Радзімы і да сваёй педагагічнай дзейнасці, якая выступае сродкам фарміравання каштоўнасных адносін да Радзімы ў дзяцей. Удасканаленне кагнітыўнай кампетэнцыі ажыццяўляецца праз пашырэнне ведаў аб культуры, традыцыях беларускага народа і мясцовых звычаях, на якіх будуецца працэс далучэння дзяцей да малой Радзімы, праз разнастайнасць форм і метадаў ажыццяўлення адукацыйнага працэсу. Удасканаленне дзейнаснай кампетэнцыі адбываецца праз абагульненне вопыту работы ўстановы дашкольнай адукацыі. Удасканаленне камунікатыўнай кампетэнцыі ажыццяўляецца сродкамі арганізацыі зносін з калегамі, дзецьмі і іх бацькамі ў працэсе розных відаў дзейнасці. Кампетэнцыя асобаснага самаўдасканалення рэалізуецца праз развіццё асобасных здольнасцей, авалоданне даследчай дзейнасцю ў працэсе рэалізацыі адукацыйнага праекта.

# РАЗДЗЕЛ 1
# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У сучасных умовах, калі адбываюцца глыбокія змены ў жыцці грамадства, адным з цэнтральных накірункаў у адукацыйнай рабоце з дзецьмі становіцца патрыятычнае выхаванне. Яно накіравана на фарміраванне і развіццё асобы, якая валодае якасцямі грамадзяніна, патрыёта Радзімы, здольнай паспахова выконваць грамадзянскія абавязкі.

Сістэме адукацыі належыць вядучая роля ў грамадзянскім станаўленні падрастаючага пакалення, выхаванню ў дзяцей любові да Радзімы, адданасці сваёй Айчыне.

Установы дашкольнай адукацыі, з'яўляючыся пачатковым звяном сістэмы адукацыі ў нашай краіне, прызваны фарміраваць у дзяцей першасныя ўяўленні аб навакольным асяроддзі, адносіны да яго, даць магчымасць ім адчуваць сябе з самых малых гадоў грамадзянамі сваёй краіны.

Розныя аспекты патрыятычнага выхавання даследаваліся філосафамі, педагогамі, псіхолагамі (В. Р. Бялінскі, Н. Ф. Вінаградава, Р. І. Жукоўская, С. А. Казлова, Н. К. Крупская, А. М. Радзішчаў, В. А. Сухамлінскі, К. Д. Ушынскі і інш.).

Даследаванні расійскіх і беларускіх вучоных, практыкаў (Н. В. Алешына, Н. Ф. Вінаградава, Л. В. Варанецкая, А. Д. Жарыкаў, Р. І. Жукоўская, С. А. Казлова, Е. М. Карнеева, Л. Я. Ніканава, Э. Г. Суслава, Л. В. Філатава, Н. Ю. Ясева і інш.) падкрэсліваюць актуальнасць і неабходнасць работы па патрыятычнаму выхаванню дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі.

Патрыятычнае выхаванне — адна з задач сацыяльна-маральнага выхавання і развіцця дзяцей. Гэта складаны працэс, асновай якога з'яўляецца развіццё маральных пачуццяў. На думку С. А. Казловай, патрыятычнае выхаванне —

гэта мэтанакіраваны працэс педагагічнага ўздзеяння на асобу дзіцяці з мэтай узбагачэння яго ведамі аб Радзіме, выхавання патрыятычных пачуццяў, фарміравання ўменняў і навыкаў маральных паводзін, развіцця патрэбнасці ў дзейнасці на агульную карысць [1].

Патрыятычнае выхаванне Л. Я. Ніканава вызначае як працэс засваення традыцыйнай культуры, фарміраванне адносін да краіны і дзяржавы, дзе жыве чалавек [3].

Мэтай патрыятычнага выхавання з'яўляецца фарміраванне асноў патрыятызму як маральнай якасці асобы, якая ўключае фарміраванне першасных ведаў аб родным краі, адносін да яго, маральных агульначалавечых каштоўнасцей, патрыятычных пачуццяў, грамадзянскасці, пачуцця прыналежнасці да вызначанай культуры, да сучасных падзей.

Патрыятызм як маральная якасць чалавека з'яўляецца вынікам мэтанакіраванага выхавання ў дашкольным узросце, які з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для далучэння дзіцяці да нацыянальнай культуры. Таму важна пачынаць выхоўваць будучага патрыёта ў гэтым узросце, калі дзіця пачынае інтэнсіўна развівацца ў сацыяльным плане. Дадзены перыяд па сваіх псіхалагічных асаблівасцях найбольш спрыяльны для фарміравання патрыятызму, таму што для дзяцей дашкольнага ўзросту характэрны высокая ўспрымальнасць, лёгкая навучальнасць, бязмежны давер у адносінах дарослых, імкненне браць прыклад з іх, эмацыянальная спагадлівасць і цікавасць да навакольнага.

На сёняшні момант паняцце «патрыятызм» мае мноства значэнняў і, адпаведна, розны змест. У сукупнасці адпаведныя азначэнні ўключаюць у структуру патрыятызму асобасныя і дзейнасныя аспекты. Патрыятызм разглядаецца як каштоўнасная ўстаноўка (К. Біякенава, А. Садвакасава), свядомасць (Т. Калдыбаева, Ф. Лаюк), светапогляд (І. Ф. Харламаў), пачуццё (І. С. Кон, Т. Калдыбаева, Э. Сталярова), матыў (Т. Калдыбаева), адносіны (І. С. Кон, Т. Калдыбаева), якасць асобы (У. Альджанава, І. Ф. Харламаў), прынцып (норма) дзейнасці (І. С. Кон, Т. Калдыбаева, І. Ф. Харламаў).

Гэтыя даследаванні дазваляюць лічыць патрыятызм якасцю асобы, яго светапоглядам, паводзінамі і дзейнасцю. Патрыятызм — якасць, якая выражаецца ў пачуццях, матывах, патрабаваннях і выніках дзейнасці, адносінах да прыроды, людзей, культуры і сябе.

Патрыятызм як маральная якасць асобы, якая фарміруецца ў дашкольным узросце, уключае:

- змястоўны кампанент — валоданне дзецьмі даступным іх ўзросту аб'ёмам уяўленняў і паняццяў аб навакольным асяроддзі (сацыяльным складзе грамадства, жыцці народа, гісторыі), выпрацоўка правільных поглядаў на факты грамадскага жыцця краіны;
- эмацыянальна-пабуджальны кампанент — перажыванне асобай становчых эмацыянальных адносін да засвоеных ведаў, навакольнага свету, любові да роднага горада (вёскі), краю, гордасць за працоўныя і баявыя поспехі народа, павага да гістарычнага мінулага роднай краіны, захапленне народнай творчасцю, любоў да роднай мовы, прыроды роднага краю, праяўленне цікавасці да звестак аб краіне, імкненне ўдзельнічаць у грамадска-карыснай працы;
- дзейнасны кампанент — рэалізацыя эмацыянальна прачулых і асэнсаваных ведаў у дзейнасці (аказанне дапамогі дарослым, праяўленне клопату аб іх, гатоўнасць выканаць заданне дарослага, беражлівыя адносіны да прыроды, рэчаў, грамадскай маёмасці, уменне адлюстроўваць атрыманыя веды ў творчай дзейнасці, наяўнасць комплексу маральна-валявых якасцей, развіццё якіх забяспечыць дзейнасныя адносіны да навакольнага асяроддзя.

У развіцці патрыятызму можна выдзеліць этапы, якія трэба ўлічваць пры выхаванні дзяцей:

I этап. Інстынктыўны патрыятызм, які выражаны ў словах: «Люблю сваю Радзіму, за што, не ведаю сам». Інстынктыўны патрыятызм вызначаны ў ідэі народнасці К. Д. Ушынскага, які пісаў «Як няма чалавека без самалюбства, дык няма чалавека без любові да Айчыны, і гэта любоў дае ключ да сэрца чалавека і магутную апору для

барацьбы з яго дурнымі прыроднымі, сямейнымі, асобаснымі і родавымі схільнасцямі». Апора на інстынктыўны патрыятызм у выхаванні дзяцей вельмі важная, таму што з'яўляецца базай для развіцця ў дзяцей патрыятызму асэнсаванага.

II этап. Патрэбнасць ў любові да блізкіх. Дадзены этап можна ахарактарызаваць як прывязанасць да сацыяльнага асяроддзя — людзей, што акружаюць дзіця, з іх менталітэтам, звычаямі, узаемадносінамі, законамі і г. д. Неабходна таксама адзначыць, што Радзіма — гэта не толькі краіна з яе мовай, гісторыяй, гэта яшчэ і людзі, якія ў ёй жывуць. Таму адносіны да родных і блізкіх, да ўсяго народа ў цэлым з'яўляюцца важным кампанентам зместу патрыятычнага выхавання.

III этап. Прывязанасць да фізічнага асяроддзя (лясы, палі, рэкі, клімат і г. д.), якая праяўляецца ў любові да прыроды і навакольнага свету і рэалізуецца ў гульнях з першых гадоў жыцця і прыемных успамінах аб дзяцінстве ў дарослага чалавека.

IV этап. Прывязанасць да духоўнага асяроддзя: народнай творчасці, літаратуры, мастацтва, навукі і г. д. Важным складнікам патрыятызму з'яўляюцца таксама веды і павага да роднай мовы.

V этап. Аб'ектыўная ацэнка роднага. Для дадзенага этапу характэрна выхаванне грамадзянскасці як вышэйшага праяўлення патрыятызму. Важнай з'яўляецца пастаноўка пытання аб гарманізацыі правоў дзяцей і дарослых у сям'і. Раўнапраўе членаў сям'і дасягаецца ў тым выпадку, калі яны жывуць агульным жыццём, ведаюць радасці і праблемы адзін аднаго і сумесна іх перажываюць. Агульныя інтарэсы будзённага жыцця забяспечваюць маральную сувязь членаў сям'і.

VI этап. Вывучэнне гісторыка-культурнага развіцця другіх народаў і пераход ад ідэі свайго народа да ідэі народа і дзяржавы ўвогуле. На гэтым этапе адбываецца арганічная сувязь патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання падрастаючага пакалення. Асаблівасцю патрыятызму становіцца выключэнне варожасці да іншых народаў і выхаванне гатоўнасці чалавека працаваць для ўсяга чалавецтва, калі ён можа прынесці яму карысць.

VII этап. Актыўны характар патрыятызму, які праяўляецца ў практычнай дзейнасці на карысць Айчыны [4].

Задачамі патрыятычнага выхавання дашкольнікаў з'яўляюцца:

1) фарміраванне ў дзяцей сістэмы ведаў аб сваёй Радзіме, якая можа быць прадстаўлена наступным чынам: прыродазнаўчыя і геаграфічныя звесткі (геаграфічныя асаблівасці роднага краю, клімату, прыроды), звесткі аб жыцці свайго народа (асаблівасці быту, працы, культуры, традыцый), сацыяльныя звесткі (веды аб родным горадзе (вёсцы), сталіцы, краіне: назва краіны, яе сталіцы, іншых гарадоў, дзяржаўная сімволіка), некаторыя гістарычныя звесткі (аб жыцці народа ў розныя часы, аб подзвігах людзей у гады Вялікай Айчыйнай вайны, веды аб гістарычных помніках горада, назвах вуліц);

2) выхаванне ў дашкольнікаў цікавасці да навакольнага свету, эмацыянальнай эмпатыі да падзей грамадскага жыцця. Прадугледжвае актывізацыю эмацыянальнай сферы асобы, выхаванне такіх пачуццяў, як любоў да родных і блізкіх людзей, роднага горада, павага да гісторыі народа, захапленне творамі народнай творчасці, любоў да прыроды, ненавісць да ворагаў;

3) уключэнне дзяцей у практычную дзейнасць па прымяненню атрыманых ведаў. Прадугледжвае фарміраванне ў дзяцей наступных навыкаў і ўменняў: адлюстраваць назапашаныя веды ў гульні, мастацкай і працоўнай дзейнасці, прымаць удзел ў грамадска накіраванай працы, беражліва адносіцца да прыроды, вынікаў працы іншых, уменне адлюстраваць веды ў мове, зносінах з дарослымі і аднагодкамі.

Пры рашэнні задач патрыятычнага выхавання кожны педагог павінен суаднесці сваю работу з мясцовымі ўмовамі і асаблівасцямі дзяцей, улічваючы наступныя прынцыпы:

- «пазітыўны настрой» (адбор ведаў адпаведна ўзросту дзяцей);
- «праз малое да большага» (фарміраванне патрыятычных пачуццяў адбываецца ў наступнай паслядоўнасці: спачатку выхоўваецца любоў да бацькоў, роднага дому, да дзіцячага садка, затым да горада, да ўсёй краіны);

- непарыўнасць і пераемнасць адукацыйнага працэсу;
- дыферэнцыраваны падыход да кожнага дзіцяці, максімальны ўлік яго псіхалагічных асаблівасцей, магчымасцей і схільнасцей;
- рацыянальнае спалучэнне розных відаў дзейнасці, адэкватны ўзросту баланс інтэлектуальных, эмацыянальных і рухальных нагрузак;
- дзейнасны падыход;
- развіццёвы характар навучання, заснаваны на дзіцячай актыўнасці [2].

Умовай патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту, па С. А. Казловай, выступае стварэнне вакол дзіцяці абставін, якія садзейнічаюць фарміраванню ведаў аб Радзіме, эмацыянальнаму водгуку і выклікаюць патрэбу ў дзейнасці.

Асоба выхавацеля лічыцца важнай умовай ў працэсе фарміравання вышэйшых маральных пачуццяў. Паколькі дзіця не можа пазнаць навакольны свет іначай, як праз дарослага, то дарослы выступае пасрэднікам паміж дзецьмі і грамадствам. Гэта пасрэдніцтва носіць складаны характар. Дарослы вучыць дзіця разумець навакольнае асяроддзе, пэўным чынам адносіцца да яго, вучыць спосабам удзелу ў ім, у даступнай форме знаёміць з маральнымі нормамі, прынцыпамі. Пры гэтым важна, што дарослы з'яўляецца і арганізатарам жыцця дзіцяці, і аб'ектам пазнання, і рэальным носьбітам тых маральных каштоўнасцей, да якіх ў дзяцей фарміруюцца пэўныя адносіны. Іншымі словамі, дарослы сам выступае ў якасці ўзору паводзін і адносін да рэчаіснасці. Чым больш ідэальны ўзор, тым вышэй гарантыя дасягнення поспеху ў выхаванні [1].

Сродкамі выхавання любові да Радзімы, якія дапамагаюць дзецям эмацыянальна ўспрымаць навакольнае асяроддзе, з'яўляюцца мастацкае слова, музыка, мастацтва, традыцыі, гістарычныя звесткі, а таксама дзейнасць (гульня, праца), святы, якія адзначаюцца ў краіне і дзіцячым садку [1].

Да метадаў, накіраваных на фарміраванне маральных пачуццяў, уяўленняў, меркаванняў і ацэнак. В. Г. Нячаева і Т. А. Маркава адносяць гутаркі на этычныя тэмы, чытанне мастацкай літаратуры і пераказ прачытанага, разгляданне

і абмеркаванне карцін, ілюстрацый, прагляд фільмаў, тэлеперадач.

Адным з метадаў пры азнаямленні дашкольнікаў са славутымі людзьмі і мясцінамі роднага краю з'яўляецца метад праектаў. Мэта праекту вызначаецца як ажыццяўленне комплекснага падыходу да выхавання ў духу патрыятызму, далучэнне дашкольнікаў да гісторыі і культуры роднага горада, мясцовых славутасцяў, выхаванне любові і прывязанасці да роднага краю. У аснову такога праекту пакладзены шэраг прынцыпаў:

- прынцып гістарызму рэалізуецца шляхам захавання храналагічнага парадку апісаных з'яў і зводзіцца да двух гістарычных паняццяў: мінулае (даўным-даўно) і сучаснае (у нашы дні);
- прынцып гуманізацыі прадугледжвае ўменне педагога стаць на пазіцыю дзіцяці, улічваць яго думкі, не ігнараваць яго пачуцці і эмоцыі, бачыць ў дзіцяці раўнапраўнага партнёра, а таксама арыентавацца на вышэйшыя агульначалавечыя паняцці — любоў да сям'і, роднага краю, Айчыны;
- прынцып дыферэнцыяцыі заключаецца ў стварэнні аптымальных умоў для самарэалізацыі кожнага дзіцяці ў працэсе засваення ведаў аб родным горадзе (вёсцы) з улікам узросту, назапашанага ім вопыту, асаблівасцей эмацыянальнай і пазнавальнай сферы і інш.;
- прынцып інтэграцыі рэалізуецца ў супрацоўніцтве з сям'ёй, дзіцячай бібліятэкай, музеямі горада і г. д.

Змест краязнаўчага матэрыялу вызначаецца з улікам спалучэння ўсіх відаў дзейнасці пры знаёмстве з гісторыка-культурнымі асаблівасцямі роднага краю.

Такім чынам, задача ўстановы дашкольнай адукацыі, педагогаў і бацькоў заключаецца ў стварэнні ўмоў, якія забяспечваюць рэалізацыю комплекснага падыходу ў рашэнні задач патрыятычнага выхавання: фарміраванне ведаў, пачуццяў, адносін і патрэбнасцей у дзейнасці, накіраванай на захаванне і прымнажэнне багаццяў Радзімы.

# РАЗДЗЕЛ 2
# АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОВЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ПА ПАТРЫЯТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Дашкольнае дзяцінства з'яўляецца першай і вельмі важнай ступенню ў выхаванні патрыятызму дзіцяці. Менавіта дашкольны ўзрост — важнейшы перыяд станаўлення асобы, калі закладваюцца перадумовы якасцей чалавека-грамадзяніна, развіваюцца ўяўленні дзяцей аб чалавеку, грамадстве і культуры.

Выхаванне патрыятызму ў падрастаючага пакалення — адна з самых актуальных задач нашага часу. За мінулыя гады адбываліся вялікія змены ў адносінах людзей да нашай гісторыі, пераацэнка маральных каштоўнасцей. На жаль, у наш час матэрыяльныя каштоўнасці дамінíруюць над духоўнымі, а ўяўленні аб дабрыні, вялікадушнасці ў дзяцей часта бываюць скажонымі.

Маральна-патрыятычнае выхаванне з'яўляецца адным з важнейшых элементаў грамадскай свядомасці, менавіта ў гэтым аснова жыццядзейнасці любога грамадства і дзяржавы, пераемнасці пакаленняў. Разумеючы актуальнасць гэтай праблемы на сучасным этапе, педагогі нашай установы дашкольнай адукацыі лічаць, што фарміраванне асобы дзіцяці немагчыма без фарміравання ўсведамлення сваёй этнічнай прыналежнасці да культуры народа.

Работу па выхаванню патрыятызму мы пачыналі з вывучэння нарматыўнай прававой базы і метадычнай літаратуры, якая сёння дазваляе разгледзець з розных бакоў пытанні патрыятычнага выхавання, падабраць формы і метады работы, што найбольш адпавядаюць канкрэтным умовам работы ў нашым дзіцячым садзе з апорай на асноўныя раздзелы і задачы праграмы дашкольнай адукацыі.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца павышэнне цікавасці грамадства да этнічнай культуры як у Беларусі, так і ва ўсіх краінах Еўропы. Праблема сцвярджэння сваёй культурнай ідэнтычнасці і непаўторнасці становіцца вызначальнай у час глабалізацыі і ўніверсалізацыі жыцця.

Неабходна адзначыць, што этнічная культура праяўляецца літаральна ва ўсіх галінах жыцця этнасу: у мове, у выхаванні дзяцей, у народных строях, у побыце, у фальклоры. Разам з тым этнічная культура з'яўляецца ўнікальным фенаменам сусветнай культуры.

Наша дзяржава надае вялікую ўвагу выхаванню псіхічна і фізічна здаровага чалавека. Палітыка Рэспублікі Беларусь накіравана на адраджэнне нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, таму што менавіта здаровае пакаленне, якое ўсведамляе сваю нацыянальную годнасць, свае карані, культуру, — трывалы аплот краіны.

Прызнанне прыярытэту этнакультуры і агульначалавечых каштоўнасцей патрабуе пошуку новых спосабаў і магчымасцей уключэння ў гэту галіну маленькага дзіцяці ў перыяд фарміравання яго асобы.

У нашым дзіцячым садзе выхаванне патрыятызму дзяцей ажыццяўляецца кожную хвіліну у розных відах дзіцячай дзейнасці, формах актыўнага адпачынку. Тэматычнае планаванне спрыяе эфектыўнаму засваенню дзецьмі ведаў аб сваёй сям'і, родным краі, сваёй краіне, аб працы людзей. Усе прапанаваныя тэмы лагічна звязаны паміж сабой і разам складаюць цэласны аповед аб краіне. Работа грунтуецца на цесным супрацоўніцтве ўсяго педагагічнага калектыву з актыўным уключэннем бацькоў.

Дзіцяці цяжка адчуць, зразумець сэнс паняцця «Радзіма» без ведання гісторыі свайго роду, суадносін з гісторыяй месца пражывання. Радзіма як найвышэйшая духоўная каштоўнасць патрыятызму, як прастора духоўнай культуры знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры, музыцы, быце, у абрадах. Яна фарміруе нацыянальна-культурнае аблічча кожнай асобы,

надзяляе яе цэласнасцю і сэнсам, спрыяе самавызначэнню і выяўленню яе здольнасцей і магчымасцей.

Азнаямленне з традыцыямі і звычаямі народа і далучэнне да іх — значная частка работы па патрыятычнаму выхаванню дашкольнікаў.

Пры планаванні адукацыйнай работы мы ўлічвалі тое, што новыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы патрабуюць новых выхаваўчых тэхналогій, новага падыходу да праблемы выхавання ў цэлым і выхавання патрыятызму ў прыватнасці.

## 2.1 Накірункі педагагічнай дзейнасці па фарміраванню асноў патрыятызму ў дашкольнікаў

Формай удасканалення прафесійных кампетэнцый з'яўляецца стварэнне педагогамі праектаў арганізацыі адукацыйнага працэсу. Работа над праектам дазваляе педагогам комплексна падысці да вызначанай дзейнасці, выпрацаваць свой светапогляд, звязаны з каштоўнаснымі арыентацыямі, здольнасць выбраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, дазваляе ўдасканаліць свой педагагічны вопыт, раскрыць свае асаблівасці як суб'екта педагагічнай дзейнасці. Гэта ў цэлым садзейнічае павышэнню прафесійнага ўзроўню педагогаў праз правядзенне семінараў (дадатак А), іх прафесійных кампетэнцый і адначасова ўдасканаленню адукацыйнага працэсу ўстановы дашкольнай адукацыі.

Адной з адукацыйных задач установы дашкольнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне у дзяцей дашкольнага ўзросту асноў патрыятызму. У дзіцячым садзе створана творчая група педагогаў, якая працуе над адукацыйным праектам па фарміраванню патрыятычных пачуццяў (дадатак Б). Калектывам распрацаваны перспектыўны план адукацыйнай работы на навучальны год, які ўключае наступныя накірункі педагагічнай дзейнасці па фарміраванню патрыятызму ў дзяцей дашкольнага ўзросту:

1) знаёмства дзяцей з народнымі традыцыямі і абрадамі праз актыўны ўдзел у фальклорных святах і абрадах (Каляды, Гуканне вясны, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі, Багач); святах пасёлка (вёскі), вуліц, фэстах; фестывалях беларускай культуры «Родныя напевы», «Не пусцім мову на звод», «Беларуская скарбонка», «Танцы беларускія», «Народныя святы, абрады, звычаі»; народнай гульнятэцы;

2) дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць дзяцей: вышыўка на кардоне швамі «іголка наперад» «беларускі крыжык»; вышыўка на тканіне швом «беларускі крыжык» (сурвэткі, ручнікі); ніткаграфія; аплікацыйная дзейнасць і пляценне з саломкі; ткацтва на дзіцячых ткацкіх станках; лепка з гліны; праца з ільновалакном;

3) збор, падрыхтоўка, сістэматызацыя нагляднага матэрыялу і дапамога калегам пры падрыхтоўцы да мерапрыемстваў па тэме «Беларусь» (стварэнне базавага кабінета: «Быт беларусаў», «Даўным-даўно», «Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць дзяцей», «Знакамітыя землякі», «Наш пасёлак: сёння і заўтра», «У дапамогу выхавацелю»);

4) распрацоўка метадычных матэрыялаў і рэкамендацый для педагогаў пры правядзенні мерапрыемстваў па тэме «Беларусь»: выставы метадычных дапаможнікаў, навуковай літаратуры; сцэнарыі свят, сустрэч, экскурсій;

5) пошук землякоў, якія цікавяцца дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, займаюцца рамёствамі, і наладжванне творчых сустрэч з імі; удзел у розных выставах;

6) распрацоўка ідэй і праца па іх рэалізацыі пры афармленні ў нацыянальным стылі групавога пакоя, веранды і пляцоўкі «Сялянская сядзіба» на тэрыторыі ўстановы дашкольнай адукацыі: «Бабуліна хата»; «Калодзеж»; «Паедзем на млын»; «Рабінавы адпачынак»;

7) правядзенне тэарэтычных і практычных семінараў, кансультацый з калегамі па дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці з дзецьмі: вышыўка (паясы для народных касцюмаў хлопчыкам, кашулькі і спаднічкі для народных касцюмаў дзяўчынкам і г. д.); праца з саломкай (пляценне галаўных

абручоў для дзяўчынак, выраб пацерак, прадметаў інтэр'еру для афармлення памяшканняў установы);

8) вядзенне дакументацыі па арганізацыі дзейнасці фальклорнай студыі, аналіз навыкаў і ўменняў дзяцей, прапагандаванне дзейнасці сярод устаноў дашкольнай адукацыі раёна.

Азначаныя накірункі дзейнасці па патрытычнаму выхаванню забяспечваюць: непарыўнасць і сістэматычнасць адукацыйнай працы на працягу года; уключэнне зместу патрыятычнага выхавання ва ўсе віды дзіцячай дзейнасці; улік ўзроставых магчымасцей дзяцей; права выбару педагогамі, бацькамі, дзецьмі формы і зместу дзейнасці; цесную ўзаемасувязь дзяцей з бліжэйшым соцыумам; актывізацыю ўзаемасувязі з бацькамі дзіцяці і са старэйшым пакаленнем; стварэнне ўмоў, калі суб'екты ў працэсе ўзаемаадносін вучацца адзін у аднаго; фарміраванне пазітыўных адносін да ўстановы дашкольнай адукацыі, калектыву з боку сям'і, грамадства; узбагачэнне развіццёвага асяроддзя, назапашванне метадычных і практычных матэрыялаў, якія дазваляюць зрабіць працэс яшчэ больш актыўным і даступным; удасканаленне прафесійных кампетэнцый педагогаў.

## 2.2 Фарміраванне асноў патрыятызму ў дзяцей праз праект «Фестывалі беларускай культуры»

З мэтай рэалізацыі вызначаных накірункаў адукацыйнага працэсу па арганізацыі патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту і адначасова ўдасканалення прафесійнай кампетэнцыі педагогаў у рамках інавацыйнага праекту «Укараненне каштоўнасна-нарматыўнай мадэлі прафесійнай дзейнасці выхавацеля ўстановы дашкольнай адукацыі» творчай групай педагогаў распрацавана праграма рэалізацыі праекту «Фестывалі беларускай культуры» (дадатак В). Праект

рэалізуецца на працягу некалькіх гадоў і прадугледжвае арганізацыю наступных фестываляў: «Родныя напевы» (прысвечаны беларускай народнай песні); «Беларуская скарбонка» (вопыт дзейнасці па дэкаратыўна-прыкладному мастацтву); «Народная гульнятэка» (народныя гульні); «Танцы беларускія» (актывізацыя педагагічнай дзейнасці калектыва па вывучэнню народных танцаў і папулярызацыі іх у грамадстве).

Напярэданні кожнага фестывалю ва ўсіх ўзроставых групах адбываюцца выніковыя мерапрыемствы па тэме «Беларусь — мая Радзіма».

## Сцэнарый фестывалю
## Танцы беларускія

Распрацавала В. С. Кунютка, педагог вышэйшай катэгорыі.

*Мэта:* знаёміць дзяцей рознага дашкольнага ўзросту з народнымі танцамі.

*Задачы:* павышаць узровень прафесійнай кампетэнтнасці педагога, развіваць творчы патэнцыял у выкарыстанні народных танцаў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу; фарміраваць зацікаўленнасць сям'і да сумеснай дзейнасці з дашкольнай установай па выхаванню дзяцей; умацоўваць іміжд, павышаць аўтарытэт дашкольнай установы сярод бацькоў, соцыуму; спрыяць самарэалізацыі і самавыражэнню дзяцей, бацькоў, калег; спрыяць адражэнню, папулярызацыі народных танцаў, вяртанню іх ў жыццё маладога пакалення, захаванню і перадачы іх дзецям.

*Удзельнікі:* дзеці чатырох—шасці гадоў, выхаванцы ўстановы дашкольнай адукацыі, і іх бацькі; супрацоўнікі дашкольнай установы; сваякі, сябры дзяцей; іншыя госці, запрошаныя на свята.

## ХОД ФЕСТЫВАЛЮ

Зала аформлена ў народным стылі: упрыгожана вышыванкамі дзяцей, бацькоў, супрацоўнікаў установы дашкольнай адукацыі. Д з е ц і, б а ц ь к і, с у п р а ц о ў н і к і дашкольнай установы сядзяць, утвараючы круг.

П е р ш ы   в я д у ч ы
*(чытае верш Петруся Броўкі)*
Трэба ведаць — сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося…
Як сахой даўней аралі,
Як смыком зямлю барлялі,
Як з сявалкі збожжа зерне
Рассявалі чорнай жменяй…
Трэба ведаць… І пра тое
Што спявалі, як гулялі,
Апраналі што? Якое?..
Трэба ведаць! Сэрца просіць!

Д р у г і   в я д у ч ы. Гэтым вершам Петруся Броўкі мы пачынаем нашу вечарыну. І прысвечана яна танцам. Давайце ўспомнім: як танцавалі раней беларусы? Задумаемся: як цяпер танцуем мы? І падумаем: а як будуць танцаваць нашы дзеці з цягам часу? Ёсць над чым задумацца! Згодны? Аб гэтым мы сёння і пагаворым. Маленькі чалавечак толькі-толькі навучыўся стаяць, хадзіць, а ўжо, пачуўшы музыку, прысядае, кружыцца, пляскае у далоні — просіць душа танца! І першымі запрашаем нашых самых маленькіх удзельнікаў.

Дзеці малодшай групы «Пралесачка» танцуюць беларускі танец «У карагодзе мы былі» (беларуская народная мелодыя).

П е р ш ы   в я д у ч ы. Стаць у круг, адчуць далонню сябра — адзінства эмоцый, перажыванняў, жаданняў. Многія народныя гульні пабудаваны на гэтай аснове. А яшчэ без карагодных танцаў не абыходзіцца ні адзін абрад. І водзяць карагоды дзеці, моладзь, ды і сталыя людзі. А мы папросім дзяцей другой малодшай групы «Сонейка» парадаваць нас яшчэ адным беларускім танцам.

Дзеці другой малодшай групы танцуюць «Крыжачок».

Д р у г і   в я д у ч ы. Растуць дзеці, рухі іх становяцца больш дакладнымі і спрытнымі, а танцавальныя фігуры —

больш складанымі і разнастайнымі. Паглядзіце ў выкананні дзяцей сярэдняй групы «Рамонкі» беларускі танец «Юрачка».

Танцуюць дзеці сярэдняй групы.

П е р ш ы   в я д у ч ы. Ёсць у беларусаў адзін асаблівы танец, пра які нават песня складзена: паміж Польшчай і Расіяй — полька беларуская, між Літвой і Украінай — полька беларуская. Танцуюць польку сталыя людзі, і юнакі, і дзеці. Просім дзяцей старэйшай групы «Званочкі» парадаваць сябе і нас «Полькай-Янкай».

Дзеці выконваюць беларускі народны танец.

Д р у г і   в я д у ч ы. Менавіта зараз, ва ўмовах духоўнага крызісу, падзення нораваў, пачынае ўзрастаць цікавасць да народных традыцый, да беларускіх песень, танцаў, іх выхаваўчых і адукацыйных аспектаў. Распрацоўваюцца метадычныя і музычныя матэрыялы, якія дапамагаюць зрабіць працэс навучання дзяцей танцаў эфектыўным і цікавым. У нашай дашкольнай установе дзейнічае гурток танцавальна-рытмічных практыкаванняў «Сонечныя зайчыкі», удзельнікі якога зараз выступяць з танцавальна-гульневай кампазіцыяй «Абцасік». Музычнае суправаджэнне — беларуская полька.

Дзеці выконваюць беларускую польку «Абцасік».

П е р ш ы   в я д у ч ы. Культура збліжае людзей, у песнях і танцах жыве душа народа. Як нам, беларусам, не зразумець культуру рускага, літоўскага, чэшскага народа? Мы ж суседзі, вякамі жылі побач, радніліся нашы культуры, уздзейнічалі адна на другую. Вельмі важна змалку у дзяцей фарміраваць гэтае ўзаемаразуменне і ўзаемаўспрыманне праз пазнанне культур розных народаў. Дзеці нашай дашкольнай установы падрыхтавалі танцы народаў свету і выступаюць з імі.

Другая малодшая група «Пралеска» прадстаўляе рускую танцавальную кампазіцыю «Мишка с куклой». Другая малодшая група «Сонейка» пакажа

«Чешскую польку». Сярэдняя група «Рамонкі» выступае з літоўскім народным танцам. Старэйшая група «Званочкі» радуе рускім народным танцам «Выйду ль я на реченьку». Дзяўчынкі старэйшай групы «Аксамікі» здзівяць нас карагодам на рускую народную песню «Во саду ли в огороде». Гурток «Сонечныя зайчыкі» пакажа нам карагод на рускую народную песню «Ой, заря ты, зорюшка».

Д р у г і в я д у ч ы. Таленавітых дзяцей выхоўваюць таленавітыя педагогі. І праўда, каб вучыць, трэба самому ўмець. А мы і ўмеем! Глядзіце і дзівіцеся!

Дзеці выконваюць танец «Кругавая кадрыля», апрацоўка К. Паплаўскага.

П е р ш ы в я д у ч ы
Ой, музыка, рэж за двох,
Не шкадуй ты нашых ног!
Нашы ногі не баляць —
Яны хочуць танцаваць!

Д р у г і в я д у ч ы. Калі хто з вас падумаў, што ён не ўмее танцаваць народныя танцы, то скажу вам, што ён памыляецца. Проста мы рэдка іх танцуем. Можа, нам часу не хапае, а можа, думаем, што мода сышла на такія танцы, а можа, не бывае адпаведнага настрою? А сёння якраз такі час, такі настрой. І вы гатовы танцаваць, дарагія мамы?

Музыкі, грайце, у цымбалы біце!
Гарадзішчанскія харашухі,
Танцаваць ідзіце!

Выконваецца беларускі народны танец «Полька».

П е р ш ы в я д у ч ы
Ой, топну нагой
Ды прытопну другой,
Колькі я не тапачу —
Танцаваць яшчэ хачу!

Выконваецца беларускі народны танец «Кракавяк».

Д р у г і в я д у ч ы. Дзякуй мамам, дзякуй дзеткам, і сяброўкам, і суседкам! Мяняюцца часы, мяняецца мода, і моладзь сягоння танчыць зусім другія танцы! А давайце мы з вамі

проста будзем помніць самі, танцаваць і дзецям паказваць — вучыць таму, чаму нас навучылі. Будзем берагчы тую культурную спадчыну, што нам перадалі нашы продкі, і перададзім яе нашым дзецям. І побач з народнай музыкай няхай гучаць і сучасныя рытмы! Удзельнікі гуртка «Сонечныя зайчыкі» падрыхтавалі для ўсіх падарунак.

Дзеці выконваюць «Снежны танец» на песню «Белая зіма» (музыка Р. Квінта, словы В. Куроўскага).

П е р ш ы  в я д у ч ы. А зараз запрашаю ўсіх, хто ўмее і не ўмее, на «Танец з хусцінкай».

Гэй вы, госцейкі, кругом.
Ды не спіце ж моцным сном.
А хадзіце раз у год
Паскакаць у карагод!

Выконваецца «Танец с хусцінкай» на матыў беларускага народнага танца.

## Фрагмент тэарэтычна-практычнага семінара
## Беларускія ручнікі у народных абрадах і звычаях

*Мэта:* пашырыць веды ўдзельнікаў мерапрыемства аб народных абрадах і традыцыях.

*Задачы:* удакладніць уяўленні матуль аб правілах вышыўкі ручнікоў «крыжыкам»; пазнаёміць з традыцыямі выкарыстання ручнікоў у абрадах; падрыхтаваць ручнікі, вышытыя дзяўчынкамі, да свята «Ручнічок сабе рыхтавала»: аздабленне краёў.

*Удзельнікі:* дзяўчынкі старэйшай групы і іх матулі, вядучы.

*План сустрэчы:*

- Выступленне-апавяданне «Код шчасця».
- Гутарка «Залатыя правілы».
- Знаёмства са спосабамі і прыёмамі аздаблення краёў ручнікоў: карункі вязаныя, карункі, выробленыя фабрычным спосабам, кутасы, тасьма і г. д.; выбар спосабаў апрацоўкі.
- Дапамога і кансультацыі.

*Дамашняе заданне:* прышыць карункі, вымыць і адпрасаваць ручнікі.

**Выступленне-апавяданне «Код шчасця».** Кожная дзяўчынка з дзяцінства марыць быць нявестай, удала выйсці замуж і жыць шчасліва. І рэдка хто ведае, што нашы прабабулі ўмелі сваё будучае шчасце кадзіраваць з дапамогай вышыўкі.

Іголка сама па сабе — гэта выдатны засцярог, энергетычны праваднік, які зашывае ўсе думкі і мары ў палатно.

А палатно не што іншае, як святы скрутак, які нясе ў сабе велізарны струмень пазітыўнай энергіі.

Аб'яднаўшы разам два гэтыя наймагутнейшыя энергетычныя праваднікі, што атрымаем? А калі яшчэ прыкласці да гэтага трохі старання, умення, добрых, станоўчых думак, вынік не прымусіць сабе доўга чакаць.

Для чаго патрэбны на вяселлі ручнікі? Абавязкова іх рыхтавалі: пад хлеб-соль; маладым пад ногі; злучаць рукі нявесце і жаніху; для свата і свацці; пад каравай; на абраз.

А далей — па жаданню бацькоў і згодна са звычаямі мясцовасці.

**Гутарка «Залатыя правілы».** Вядучы знаёміць удзельнікаў з галоўнымі правіламі вырабу і ўпрыгожвання ручнікоў:

1. Нельга ўпрыгожваць ручнікі мярэжкамі: жыццё будзе дзіравым.

2. Нельга вышываць вясельныя ручнікі ўначы — у гэты час сутак вышываюць толькі магічныя рэчы.

3. Вышыўка павінна быць чыстай і акуратнай: вонкавы бок — для людзей, сподні — для Бога.

4. Ручнік — гэта дарога жыцця, таму палатно яго павінна быць цэльным і бесперапынным, як жыццё (не ўстаўляйце ў сярэдзіну ручніка ніякіх карункаў, матузоў, гэтым вы толькі нашкодзіце, разрэзанае жыццё ўжо не сшыеш, як бы не імкнуўся).

5. На вясельных ручніках вышываюць пары такіх птушак, як сокал, індык, паўлін, певень. Не вышываюць зязюль — удовін знак, салаўёў — знак нежанатых хлопцаў (каб муж не здрадзіў).

6. Усе памеры ручніка (шырыня, даўжыня) павінны быць кратнымі 7.

7. Вышыўкай павінна быць запоўнена адна чвэрць кожнай паловы ручніка

8. Цэнтр ручніка абавязкова павінен заставацца пустым, без вышыўкі, — Божае месца. Становячыся на ручнік, маладыя атрымліваюць благаславенне ад Бога.

9. Пасля вяселля ручнікі захоўваюцца ў сям'і маладых, як знак шчаслівага сямейнага жыцця, скручанымі ў трубачку, каб усялякая нечысць па крузе пахадзіла і зразумела, што тут ёй рабіць тут няма чаго.

10. Ручнікі, асабліва тыя, што кладуць маладым пад ногі, выкарыстоўваюць адзін раз! У выпадку вельмі шчаслівага сямейнага жыцця ў спадчыну перадаюць толькі ўзор, а ручнік вышываюць новы.

11. Ручнікі не бяруць напракат — вы ж лёс не бераце і не пазычаеце.

## Свята
## **Вячоркі ў цёткі Васіліны**

Распрацавала Л. В. Рудая, педагог першай катэгорыі.

*Мэта:* пазнаёміць дзяцей з народнай творчасцю.

*Задачы:* даць магчымасць дзецям прадэманстраваць веды і ўменні па тэме «Беларусь»; стварыць ўмовы для эмацыянальнага камфорту дзяцей.

*Удзельнікі:* дзеці чатырохгадовага ўзросту, Васіліна ў ролі вядучай.

*Абсталяванне:* хустачкі, ручнікі льняныя, цацкі, вырабы з саломкі, дрэва, гліны.

*Папярэдняя работа:* разгляданне карцін з беларускімі нацыянальнымі касцюмамі, ручнікоў, вырабаў з саломкі і гліны; завучванне вершаў, песень; экскурсія ў этнаграфічны куток.

### ХОД СВЯТА

Васіліна. Сення мы сабраліся, каб пагаварыць, як мы жывём, дзе мы жывём, хто ж мы такія? Дзеці, скажыце, як

называецца наша краіна? А як называюцца ўсе людзі, якія жывуць у Беларусі?

Гучаць адказы дзяцей.

Х л о п ч ы к
Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я — хлопчык-беларус.

Д з я ў ч ы н к а
Цік-так ходзікі,
Мне чатыры годзікі.
Чуб ільняны светла-русы,
Тата з мамай — беларусы.

В а с і л і н а. Мы беларусы і вучымся спяваць беларускія песні.

Выконваецца песня «Свінка ў лазню хадзіла» (музыка А. Э. Рэмізоўскай, словы П. Граніт).

Д з я ў ч ы н к а
Змалку звалі цябе
Мы сваёю радзімаю.
Беларусь, Беларусь,
Як ты сэрцу любімая!

Х л о п ч ы к
Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць.
Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць!

В а с і л і н а. Умеюць беларусы працаваць, умеюць весела адпачываць. Ніводнае свята не абыходзіцца без песень.

Гучыць песня «Кума, мая кумачка» (беларуская народная мелодыя).

Д з я ў ч ы н к а
Тварык румяны,
Белая хустачка.

Я ўжо ведаю,
Я — беларусачка.

Другая дзяўчынка
Я — дзяўчынка-беларуска
З васільковымі вачыма.
Хоць малая, але знаю,
Беларусь — мая Радзіма.

Выконваецца песня «Адмарозіў лапкі» (музыка С. Альхімовіч, словы У. Мураўейкі).

Васіліна. А якія прыгожыя святы адзначаюць беларусы: Каляды, Купалле, Вялікдзень, Гуканне вясны, і ніводнае з іх не абыходзіцца без карагодаў.

Выконваецца беларускі народны танец «У карагодзе мы былі».

Васіліна. Нашы мамы любяць сваю Радзіму, але больш за ўсе яны любяць сваіх дзяцей, клапоцяцца аб іх.

Праводзіцца гульня «Пакармі сваё дзіця» (з закрытымі вачыма).

Васіліна. Шмат песень беларускіх мы праспявалі, але ёсць у нас яшчэ адна — вясёлая.

Гучыць песня «Бусел» (апрацоўка А. Рашчынскага).

Васіліна
Нам хораша ў нашай краіне.
Жыві, Беларусь, прыгажэй!
Пад небам праменістым, сінім
Хай Божа цябе беражэ!

Дзякуем усім, хто зайшоў да нас на вячоркі. Заходзьце часцей, яшчэ будзе весялей.

## Музычна-тэатральнае свята
## **Зямля з блакітнымі вачыма**

Распрацавала А. В. Масюкевіч, педагог другой катэгорыі.

*Мэта:* стварэнне ўмоў і магчымасцей для рэалізацыі набытых ведаў і ўменняў па тэме «Як ты сэрцу люба, дарагая Беларусь».

*Задачы:* спрыяць адраджэнню і захаванню народных традыцый, звычаяў і абрадаў; фарміраваць нацыянальную самасвядомасць; спрыяць самавыражэнню і самарэалізацыі кожнага дзіцяці.

*Удзельнікі:* дзеці шостага года жыцця, баба, дзед, вядучая, хлопчык у ролі кабылы, Несцерка.

## ХОД СВЯТА

У зале ціха гучыць беларуская народная музыка. Заходзіць д з я ў ч ы н к а ў беларускім касцюме.

Д з я ў ч ы н к а
Я сардэчна ўсіх вітаю.
І на свята запрашаю.
Бачу, што ўсе гатовы,
Значыць трэба пачынаць.
Свята наша будзем з вамі адзначаць.

Заходзяць усе дзеці. Гучыць песня «Родная зямля» (музыка І. Саўчук, словы А. Ружанцавай).

В я д у ч а я. Добры дзень, паважаныя госці! Запрашаем Вас на музычна-тэатральнае свята «Зямля з блакітнымі вачыма». У кожнага з нас ёсць родны куточак. Ён там, дзе ты нарадзіўся і жывеш, дзе жывуць тата і мама, сябры. Гэта — твая Радзіма. Таму ты і адчуваеш, што лепш нідзе не бывае, як дома, на Радзіме. У народзе кажуць: «Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне матка». І сапраўды, — дзе маці нарадзіла, там і Радзіма.

Х л о п ч ы к
Васілёчкі сінеюць у полі,
Першы з'явіўся грыбок,
Падскоквае зайчык на волі —
Гэта мой родны куток.

Д з я ў ч ы н к а
Сеў матылёк на лісток,
Калышацца жыта ў полі, —
Гэта мой родны куток,
Яго не забуду ніколі.

Х л о п ч ы к
У кожнага лісточка,
У кожнага ручайка —
Галоўнае на свеце —
Радзіма ёсць свая.

Гучыць песня «Прывітальная» (беларуская народная мелодыя).

Д з я ў ч ы н к а
Дзяржаўны герб, як сонца, свеціць
У нашым сэрцы, над зямлёй.
І Беларусь у белым свеце
Нязгаснай славіцца красой.

Х л о п ч ы к
І там, дзе нарадзіліся,
Дзе шчасліва жывём,
Краіну сваю родную
Радзімаю завём.

Д з я ў ч ы н к а
Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына,
Тваё жыццё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла — Беларусь!

Х л о п ч ы к
Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.
Мой край завецца Беларуссю,
І сам я хлопчык-беларус.

Д з я ў ч ы н к а
У нас галовы русыя,
А вочы — сіні лён.
Мы дзеці — беларусы,
Зайграем і спяём.

Х л о п ч ы к
Плыве ў блакіце белы бусел.
І луг квяцісты, як абрус.
А мы з табою беларусы,
Радзіма наша Беларусь.

Д з я ў ч ы н к а
Мы забыць сваю мову не мусім,
Каб агеньчык яе не пагас.
Пазнаюць нас, што мы з Беларусі,
Па гаворцы, па нашых вачах.

Х л о п ч ы к
Ціха звоніць у полі калоссе,
Зоркі свецяцца ў вышыні.
Наша родная мова прыносіць
Столькі ласкі, святла, цеплыні.

В я д у ч а я. Вось як добра мы сядзім, адзін на аднаго глядзім, усміхаемся. А ці ведаеце вы, што ў беларусаў заўседы жыве павага да працы, жаданне падзяліцца з сябрам горам і радасцю, жартам? Паслухайце, калі ласка, жартоўную песню.

Гучыць песня «Дражнілкі» (беларуская народная мелодыя).

В я д у ч а я. Бабка Еўка дзед Талаш сабраліся на кірмаш. Што павезлі прадаваць? Паспрабуйце адгадаць!

Выконваецца інсцэніроўка «Прадай мне, бабанька, бычка». Б а б а ўваходзіць у зал.

Б а б а *(вітаецца).* Добры дзень, дзеці, не бачылі вы бычка?

Д з е ц і. Не, не бачылі.

Б а б у л я выходзіць за дзверы, вяртаецца з бычком, за ёю ідзе Дзед.

Д з е д *(пытаецца ў бабы).* Куды збіраешся, Бабуля?

Б а б а. На кірмаш. Бычка прадаваць.

Д з е д. Прадай, Бабанька, мне бычка!

Б а б а. Бычок у мяне буры-буры, заганяе свінні, куры. Не, не прадам.

Д з е д. Прадай мне, Бабанька,бычка!

Б а б а. Бычок у мяне лысы-лысы, мые лыжкі, мые місы. Не, не прадам.

Д з е д. Прадай, Бабанька, мне бычка!

Б а б а. Бычок у мяне рабы-рабы. Кожны дзень дапамагае — тэлевізар мне ўключае. Не, не прадам!

Д з е д. Прадай, Бабанька, мне бычка!

Б а б а. А колькі дасі?

Д з е д. Бяры торбу грошай і мяне ў прыдачу!

Б а б а. Вось і старгаваліся. І торба грошай, і бычок у мяне, і Дзед у прыдачу. А цяпер, мой Дзядок, давай станцуем.

Дзед і баба танцуюць.

В я д у ч а я. Слаўна танцавалі Дзед з Бабай, павесялілі нас, а вы паслухайце нашу песню.

Гучыць песня «Полька-трапятуха» (музыка В. Волах, словы А. Макшанцавай).

Б а б а. Ой дзеткі, як весела ў вас, але мне хочацца паехаць на кірмаш. Там мы ўбачым шмат чаго цікавага.

Д з е д. А на чым мы паедзем?

В я д у ч а я. Як жа на чым? Дык на тым, на чым людзі раней ездзілі — на кабыле.

Д з е д. Дзе мы яе возьмем?

В я д у ч а я. Зараз пазавём.

Дзеці завуць разам: «Сіўка-Бурка, з'явіся, пакажыся». Адчыняюцца дзверы, забягае кабыла.

Б а б а. Ну вось, і кабыла ў нас ёсць. Можна ехаць.

Едуць пад музыку, раптам кабыла падае.

В я д у ч а я. Ой, ой, што здарылася? Кабыла павалілася? Дык яна ж не падкаваная!

Д з е д. А мы майстра паклічам.

В я д у ч а я. Якога майстра?

Д з е д. Такога чалавека, які ўсё ўмее.

В я д у ч а я. А хто ён такі?

Д з е д. Гэта Несцерка.

В я д у ч а я. Дык давайце яго паклічам.

Дзеці клічуць Несцерку. Уваходзіць Н е с ц е р к а.

Н е с ц е р к а. Добры дзень, сябры! Колькі вас тут многа сабралася, як дрэў у лесе! Сябры мае, у вас, мусіць, свята вясёлае, народнае, карагоднае?

В я д у ч а я. Гэта, Несцерка, мы цябе на свята паклікалі. Нам вядома, што ты мастак да ўсялякіх забаў. Так ці не?

Н е с ц е р к а. Так, так, я ўсюды бываў, казкі-цуды сустракаў.

В я д у ч а я. А ці бачыў ты карову, што песні спявала?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч а я. А ці бачыў ты авечку, што нясе яечкі?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч а я. А ці бачыў ты камара, які поле араў?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч а я. А ці бачыў ты каваля, каб нашу кабылу падкаваў?

Н е с ц е р к а. Каваля? Дык я сам каваль. Толькі дзе ж мой малаток? Мусіць, згубіў.

В я д у ч а я
Я праз кузню ішла,
Малаточак знайшла,
Падкуй, каваль, капыток, —
Падарую малаток.
Н е с ц е р к а. Вось цвікі, вось падкова, раз-два — і гатова!
Д з е д. Вось і добра! Тады паехалі на кірмаш.

П е р ш ы  г а н д л я р
Паклон вам, людзі дарагія,
Старыя і малыя.
Жыхароў кожнай хаты
Запрашаем на свята —
Беларускае народнае,
Вясёелае, карагоднае!

Д р у г і  г а н д л я р
Усіх, усіх, хто не ленаваўся,
Добрай справаю займаўся
І не траціў марна час,
Запрашаем на кірмаш!

Т р э ц і  г а н д л я р
Гэй, панове, сюды ідзіце!
Гэй, панове, сюды глядзіце!
Ёсць у нас лялькі-прыгажуні,
Ручнікі, дываны, кашулі, пацеркі,стужкі.
Купляйце дзяўчатам падарункі.

Н е с ц е р к а. Ай дык гандляр! Вельмі ў вас тавары прыгожыя. Трэба мне нешта купіць. Ды вось няма ў мяне грошай.

В я д у ч а я. А на нашым кірмашы не абавязкова мець грошы, галоўнае — умець спяваць і танцаваць.

Н е с ц е р к а. Я гэта ўсё ўмею — і танцаваць, і спяваць. Але ж прадайце мне гэтую хустачку за два грошы. Падару яе самай прыгожай дзяўчынцы.

В я д у ч а я. А ў нас усе дзяўчынкі прыгожыя.

Н е с ц е р к а. Тады давайце ўсе *(бярэ і раздае дзяўчынкам)*.

В я д у ч а я. Дзяўчынкі-прыгажунькі, парадуйце нас вясёлымі частушкамі.

Выконваюцца частушкі.

Д з я ў ч ы н к а
Вы на свята к нам прыйшлі,
Дарагія дзетачкі.
Гарманіст у нас прыгожы —
Грае нам прыпевачкі.

Д р у г а я д з я ў ч ы н к а
У гародзе, у крапіве
Вырасла пятрушка,
Мяне вельмі хлопцы любяць,
Бо я — весялушка!

Т р э ц я я д з я ў ч ы н к а
У Гарадзішчы на базары
Хлопцы прадаюцца.
На капейку сорак штук,
І то задаюцца.

Д з я ў ч ы н к а
Ой сукенка, ой сукенка,
Парваныя плечы.
Там такая вечарынка —
Лепш сядзець на печы.

Д з е ц і
*(хорам)*
Мы прапелі вам частушкі.
Вы скажыце ад душы —
Добрыя нашы частушкі?
Чым жа мы не малайцы!

Б а б а. Дзед, Дзед, няўжо пашкадуеш грошай і мне нічога не купіш на кірмашы?

Д з е д. Куплю, канешне! Пакажы, Гандляр, мне гэтыя чаравікі. Ой, якія прыгожыя, якраз для маёй бабулькі.

Б а б а. Дзякуй табе, Дзед *(цалуе)*, вялікі дзякуй. Ой музыкі, музыкі мае, зайграйце песню мне.
Мае ногі тупацяць, тупацяць
І на месцы не стаяць, не стаяць!

Выконваецца «Полька-Янка» — беларускі народны танец.

Д з е д. Дзякуй, даражэнькія! Добра ў вас, весела. Рады быў я з вамі танцаваць і спяваць. Але час прыйшоў, сябры, з вамі развітацца. Жадаем вам, каб у садочку, у хлявочку і ў дамочку ўсё радзіла і пладзіла. Каб былі здаровыя як вада, багатыя як зямля.

Б а б а. Жадаю вам шчаслівай долі і хлеба ўволю!

Усе сядаюць і едуць на кабыле дахаты.

В я д у ч а я. Толькі тут, у Беларусі, як нідзе, спяваюць птушкі. Толькі тут, як нідзе ў свеце, у жыце цвітуць васількі. Толькі тут, як нідзе ў свеце, умеюць шчыра любіць свой родны кут, працаваць, абараняць Радзіму, танцаваць, складаць вершы, спяваць.

Дык давайце мы ўсе будзем шанаваць, любіць нашу Радзіму, ганарыцца тым, што яна такая прыгожая, што мы з вамі — беларусы!

Пад музыку д з е ц і развітваюцца і выходзяць з музычнай залы.

Музычна-тэатральнае прадстаўленне

# Мой родны кут, мая зямля

Распрацавала Т. П. Лабука, педагог вышэйшай катэгорыі.

*Мэта:* далучэнне дзяцей да скарбаў нацыянальнай культуры, роднай мовы.

*Задачы:* спрыяць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці; фарміраваць цікавасць дзяцей да тэатральных гульняў, развіваць музычныя здольнасці; далучаць бацькоў да ўдзелу ў сумеснай музычна-тэатральнай дзейнасці.

*Удзельнікі:* дзяці пятага года жыцця, вядучы, дзяўчынка ў ролі Казы, Сымон, хлопчык ў ролі каня, Несцерка, гандляры, Лявон, Лявоніха.

*Папярэдняя работа:* чытанне вершаў беларускіх паэтаў пра Беларусь, разглядванне ілюстрацый па тэме, інсцэніроўка вершаў, падрыхтоўка касцюмаў (сумесна з бацькамі).

## ХОД ПРАДСТАЎЛЕННЯ

Д з е ц і заходзяць у залу, рассаджваюцца.

В я д у ч ы. Дарагія госці! Запрашаем вас на наша свята, прысвечанае роднай Беларусі.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны кут, твая айчына,
Твае жыццё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла — Беларусь.

Вось яна! Паглядзіце на карту — нібы кляновы лісток — наша Бацькаўшчына.

Д з я ў ч ы н к а
Я — дзяўчынка-беларуска
З васільковымі вачыма.
Хоць малая, але знаю:
Беларусь — мая Радзіма.

Першы хлопчык
Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я — хлопчык-беларус.

Другі хлопчык
Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць.
Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць.

Выконваецца беларуская народная песня «Чаму ж мне ня пець»

Вядучы. Вось як добра мы сядзім, адзін на аднаго глядзім, усміхаемся. А ведаеце, у беларусаў заўсёды жыве павага да працы, жаданне падзяліцца з сябрамі і горам, і радасцю. А які невычарпальны народны гумар!

Дзяўчынка. Прыгатавалі мы для вас забаў на розны густ.

Хлопчык. У чырвоных ботах ходзіць па балотах, бусел даўганосы жабак сабе носіць.

Дзяўчынка. Андрэй-верабей на падушцы сядзеў, усіх жабак пераеў. А адну не даеў — і жывот забалеў

Хлопчык. Сядзіць Сцёпка за сталом, накрыўшыся рукавом, ён лучыну шчыпае, ён дзяўчыну чапае.

Дзяўчынка. Чаго ты мяне чапаеш, калі вусоў не маеш? Ідзі вусы прычапі. Тады мяне зачапі .

Гучыць песня «Свінка ў лазню хадзіла» (музыка А. Рэмізоўскай, словы П. Граніт).

Хлопчык
У нас галовы русыя,
А вочы — сіні лён.
Мы — дзеці-беларусы,
Зайграем і спяём.

Д з я ў ч ы н к а
Полька ёсць у нас цудоўная,
Беларуская, шаноўная.
Як яе мы затанцуем,
Дык ніколі не сумуем.

Выконваецца беларускі народны танец «Юрачка» Заходзіць Каза з касою ў руках

В я д у ч ы. Дзеткі, глядзіце, да нас на свята і Козачка завітала. Ну-ка, Козачка, павярніся, добрым людзям пакажыся. Якая ж яна ладная ды прыгожая!

Каза паварочваецца да гасцей і дзяцей.

К а з а. Я — Каза-барада, купіла сабе касу.
Д з е ц і. Нашто табе каса?
К а з а. Сена касіць.
Д з е ц і. Нашто табе сена?
К а з а. Кароў карміць.
Д з е ц і. Нашто табе каровы?
К а з а. Малако даіць.
Д з е ц і. Нашто табе малако?
К а з а. Дзяцей паіць.
Д з е ц і. Нашто табе дзеці?
К а з а. Каб іх весяліць.
В я д у ч ы. Вось ты, Козачка, паслухай нашу песню. Мы павесялімся і цябе павесялім.

Гучыць песня «Ты, Надзейка, пакажы» (музыка І. Лучанка, словы А. Вольскага).
Адчыняюцца дзверы, заходзіць Сымон з канём.

В я д у ч ы. Хто вы такія?
С ы м о н. Я — Сымон. Спяшаюся на кірмаш, але спазніўся, бо іду пяшком.
Д з е ц і. Пяшком?
С ы м о н. Нясу пірагі мяшком.
Д з е ц і. Мяшком?
С ы м о н. Прыехаў на кірмаш звечара.

Д з е ц і. Звечара?

С ы м о н. Ды прынёс дудак рэшата.

Д з е ц і. Рэшата?

С ы м о н. Ды паставіў на стале.

Д з е ц і. На стале?

С ы м о н. Сам сеў у куце.

Д з е ц і. У куце?

В я д у ч ы. А ну, пакажы сваю дудку. І мы можам заіграць.

Выконваецца песня «Дудка» (музыка С. Альхімовіч, словы народныя).

С ы м о н. А ну, конь, паскачы!

Конь скача, пасля падае.

С ы м о н. Ой, што ж рабіць! Трэба каня падкаваць

В я д у ч ы. Не хвалюйся, Сымон, мы майстра паклічам.

С ы м о н. Якога майстра?

В я д у ч ы. Ды таго чалавека, які ўсе ўмее.

С ы м о н. А хто ж гэта?

В я д у ч ы.

А той, хто песню заспявае,
У каго гасцінцы ёсць,
Хто ў бядзе дапамагае.
Гэта — Несцерка, наш госць.
Давайце паклічам!

Уваходзіць Н е с ц е р к а.

Н е с ц е р к а. Добры дзень, сябры! Эге! Колькі вас тут сабралася! Як дрэў у лесе. Але дзе ж гэта я апынуўся? *(Азіраецца.)* Як тут красна! Як тут ясна! Браткі мае любыя! Гэта ж я на свята трапіў!

В я д у ч ы. На свята, Несцерка! Гэта ж мы цябе сюды паклікалі. Нам вядома, што ты мастак да усялякіх забаў. Так ці не?

Н е с ц е р к а. Так-так. Я ўсюды бываў, дзівы, казкі сустракаў.

В я д у ч ы. А ці бачыў карову, што песні спявала?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч ы. А ці бачыў авечку, што несла яечкі?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч ы. Бачыў камара, які поле араў?

Н е с ц е р к а. Бачыў.

В я д у ч ы. А ці бачыў каваля, які б нашу кабылу падкаваў?

Н е с ц е р к а. Каваля? Дык я ж сам каваль!

Д з я ў ч ы н к а
(*спявае*)
Я праз кузню ішла,
Малаток знайшла.
Падкуй, каваль, капыток —
Падарую малаток.

Дзеці пляскаюць у ладоні.

Н е с ц е р к а. Вось цвік, вось падкова, раз-два — і гатова!

В я д у ч ы. Паслухай, Несцерка, песню.

Хлопчыкі і дзяўчынкі выконваюць песню «Певунок» (музыка В. Сярых, словы народныя).

В я д у ч ы. Вось і добра. Ну, цяпер паехалі. А паедзем мы на кірмаш на нашым падкаваным кані. Запрагай, Несцерка!

Едуць на кірмаш.

П е р ш ы г а н д л я р. Паклон вам, людзі дарагія! Старыя і малыя. Жыхароў кожнае хаты запрашаем на свята — беларускае, народнае, вялікае, карагоднае.

Д р у г і Г а н д л я р
Усіх, усіх, хто не ленаваўся,
Добрай справай займаўся,
І не траціў марна час,
Запрашаем на кірмаш!

П е р ш ы  Г а н д л я р
Гэй, панове, сюды ідзіце!
Гэй, панове, сюды глядзіце.
Есць у нас лялькі-прыгажуні,
Ручнікі, дываны, кашулі.

Д р у г і  Г а н д л я р
Гарлачыкі, гаршэчкі паліваныя,
Сурвэткі, абрусы вышываныя.
Пацеркі, стужкі —
Купляйце, дзяўчаты-падружкі!

Н е с ц е р к а. Ай ды гандляры! Вельмі ў вас тавары прыгожыя. Трэба і мне нешта купіць, але вось у мяне няма грошай.

В я д у ч ы. А на нашым кірмашы не абавязкова мець грошы — можна і паскакаць, і паспяваць.

Н е с ц е р к а. Магу і паскакаць *(танцуе).* Вось і паскакаў. А вы танцаваць і пець умееце?

Д з е ц і *(хорам).* Умеем.

В я д у ч ы. Вось і паслухайце.

Гучыць песня «Бегаў зайка» (музыка Г. Вагнера, словы С. Пацёмкіна).

Н е с ц е р к а. Вось цяпер і купіць можна. Куплю я гэтую хустку *(дае грошы)* ды падарую самай прыгожай дзяўчыначцы.

Н е с ц е р к а. А ў нас усе дзяўчынкі прыгожыя! *(Раздае дзяўчынкам хусткі.)* Паглядзіце! Яшчэ хтосьці спяшаецца на кірмаш.

Заходзяць Л я в о н і Л я в о н і х а.

Л я в о н і х а. Лявон! Паглядзі, чаго тут толькі няма! А паглядзі, якія дзеткі, ну як тыя кветкі! Няўжо грошай пашкадуеш, нічога не купіш?

Л я в о н. Ну, пакажы свой паясок. Вельмі прыгожы! За колькі прадаеш?

П е р ш ы  Г а н д л я р. А я дарма аддаю і дзяцей весялю!

Л я в о н. Пакажы мне вось гэтыя чаравічкі! Якраз для маёй Лявоніхі! *(Купляе.)*

Л я в о н і х а. Дзякуй табе, Лявон.
Ой, музыкі, музыкі мае!
Зайграйце Лявоніху мне.
Мае ногі тупацяць,
І на месцы не стаяць.

Выконваецца беларускі народны танец «Лявоніха».

Н е с ц е р к а. Дзякуй, даражэнькія! Добра ў вас, весела і цікава. Рады быў з вамі я тут жартаваць, смяяцца. Але час настаў, сябры, з вамі развітацца. Жадаю вам, каб у садочку, у хлявочку, у полі і ў дамочку ўсё радзіла і пладзіла. Каб былі здаровыя як вада, багатыя як зямля. Жадаю вам шчасця, долі і хлеба ўволю. Да пабачэння!

Л я в о н і Л я в о н і х а. Да пабачэння! І нам час збірацца ў дарогу.

В я д у ч ы. Вось і скончылася наша свята. Мы сёння пелі і скакалі, але тое, што вы ўбачылі і пачулі, спадзяюся, закранула вашы сэрцы, выклікала пачуццё гонару за нашых дзяцей. Дзякую ўсім удзельнікам!

## Інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?» Беларусь — зялёная краіна

Распрацавала В. С. Кунютка, педагог вышэйшай катэгорыі.

*Мэта:* удакладненне і ўзбагачэнне ведаў і ўяўленняў дзяцей аб прыродзе роднага краю.

*Задачы:* фарміраваць адносіны да прыроды як да агульнага багацця, якое трэба берагчы; фарміраваць актыўную пазіцыю па захаванню прыроднага асяроддзя; развіваць увагу, памяць, мысленне, мову, уяўленне; вучыць працаваць ў падгрупе па ўстаноўленых правілах гульні, праяўляць актыўнасць; спрыяць самарэалізацыі кожнага дзіцяці.

*Удзельнікі:* дзеці шостага года жыцця, выхавацель.

Абсталяванне: фішкі для выбару, карткі-сімвалы, абазначэнні сталоў для ўдзельнікаў гульні, наборы малюнкаў, сімвал музычнай паўзы, медалі для пераможцаў.

Правілы гульні:

1) кожнае дзіця выбірае каманду па колеру фішкі самастойна: капітанамі каманд становяцца дзеці, на фішках якіх ёсць адзнака (К);

2) усе заданні каманды атрымліваюць у канвертах з каляровай адзнакай каманд;

3) адкрыць канверт з заданнем мае права капітан, ён жа даручае, якому члену каманды адказваць;

4) кожны ўдзельнік каманды мае права дапаўняць (папраўляць) партнёра па камандзе;

5) кожны адказ адзначаецца пэўнай фішкай, па колькасці якіх і вызначаецца самы актыўны ўдзельнік і каманда-пераможца;

6) ўдзельнік другіх каманд маюць права дапаўняць (і атрымліваць фішкі), калі каманда не можа справіцца з заданнем;

7) аптымальная колькасць каманд — дзве-тры, удзельнікфў — тры—шэсць чалавек;

8) заданні чаргуюцца з музычнымі (рухомымі) хвілінкамі;

9) пераможцы ўзнагароджваюцца медалямі, якія можна самастойна аформіць;

10) правілы гульні дзецям тлумачацца перад заняткам, парушальнікі караюцца штрафной фішкай.

## ХОД ГУЛЬНІ

В ы х а в а ц е л ь. Беларусь — зялёная краіна. У нашых лясах, садах, на палях, агародах можна убачыць многа розных раслін. Кліматычныя ўмовы ў нашай краіне такія, што хапае і цяпла, і свету, і вільгаці для самых разнастайных раслін. Назавіце, якая расліна лішняя, і патлумачце, чаму?

Удзельнікі атрымліваюць наборы малюнкаў раслін лесу, поля, саду, агароду.

В ы х а в а ц е л ь. Жывёльны свет Беларусі вельмі разнастайны. Мы можам убачыць жывёл у лесе, у садзе, на лузе, на балоце і паблізу вадаёмаў. Назавіце, дзе чый дом і патлумачце, як жывёла яго «будуе».

Дзецям прапануецца набор малюнкаў дзікіх жывёл. Выхавацель паказвае знак-сімвал і аб'яўляе музычную паўзу. Выконваецца вальс «Лістапад», (музыка В. Волах, словы Н. Найдзёнавай).

**Выхавацель.** А колькі розных птушак жыве на нашай зямлі! Жывуць яны і ў лясах, і побач з жыллём чалавека, і на балотах, і каля рэк, а вось жаваранак любіць будаваць свае гняздечка на полі. Дзеці, вам неабходна назваць птушку, домік, у якім жыве, дзе яна яго «будуе».

Удзельнікі атрымліваюць малюнкі птушак (па пяць у кожным канверце).

**Выхавацель.** Побач з намі многа жывых істот, якіх мы не заўсёды заўважаем, але яны з'яўляюцца вельмі важнай часткай жывой прыроды: поўзаюць, лятаюць, кусаюцца, збіраюць мёд, апыляюць кветкі. Назавіце звера, птушку ці насякомае, якіх вы бачыце на картачцы, раскажыце аб яго карысці для чалавека, прыроды.

Дзецям прапануюцца наборы малюнкаў звяроў, птушак, насякомых. Выхавацель паказвае знак-сімвал і аб'яўляе музычную паўзу.

**Выхавацель.** Адно з галоўных багаццяў Беларусі — лес, а ён вельмі патрэбен чалавеку: дровы даюць цяпло, з драўніны будуюць дамы, выкарыстоўваюць яе для вырабу мэблі і паперы. Яшчэ лес з'яўляецца і домам для жывёл, птушак, насякомых і раслін.

Удзельнікі атрымліваюць малюнкі дрэваў, кустоў, ягад, грыбоў. Называюць расліны, абагульняючае слова.

**Выхавацель.** У прыродзе няма нічога і нікога лішняга: кветачка патрэбна пчолкам, каб збіраць нектар, а пчолка патрэбна чалавеку, бо мёд чалавек ужывае ў ежу і лечыцца ім. Значыць, трэба берагчы прыроду, бо чалавек з'яўляецца часткай прыроды і зможа выжыць толькі тады, калі будзе беражліва карыстацца яе дарамі.

Дзецям прапануецца набор малюнкаў раслін, звяроў, птушак, насякомых. Набходна скласці «ланцужкі», злучыць паміж сабой малюнкі тых, хто каму патрэбен. Далей подводзяцца вынікі: падлічваюцца фішкі, вызначаецца пераможца ў камандным і ў асабістым заліку. Уручаюцца медалі.

Фальклорнае свята

# Ручнічок сабе рыхтавала

Распрацавала В. С. Кунютка, педагог вышэйшай катэгорыі.

*Мэта:* абагульніць веды дзяцей аб звычаях і абрадах беларускага народа.

*Задачы:* спрыяць адраджэнню і захаванню народных традыцый; вучыць дзяцей народным рамёствам (вышыўка «беларускім крыжыкам»); фарміраваць нацыянальную самасвядомасць; стварыць ўмовы і магчымасці для рэалізацыі набытых ведаў і ўменняў па тэме «Як ты сэрцу люба, дарагая Беларусь»; садзейнічаць самавыражэнню і самарэалізацыі кожнага дзіцяці.

*Удзельнікі:* дзяці шостага года жыцця, маці і бацька аднаго з хлопчыкаў у ролі свахі і свата, маці, бабуля, вядучы.

## ХОД СВЯТА

Зала аформлена ў народным стылі (лаўкі, ложак, усюды вышытыя і тканыя рэчы, вырабы з дрэва, гліны, саломкі). На сцяне вісіць прыгожы беларускі ручнік. Выстава работ дзяцей: вышыўка, выцінанка, вырабы з гліны, саломкі.

Вядучы *(да гасцей).* У самым цэнтры Еўропы ёсць незвычайнай прыгажосці куточак зямлі, які называецца Беларусь. І жыве тут працавіты і прыгожы, добры і таленавіты народ — беларусы. За сваю гісторыю шмат гора зведала беларуская зямля. Але беларускі народ заўсёды мужна бараніў сваю зямлю, змагаўся і змагаецца з наступствамі Чарнобыльскай аварыі. Вялікую сілу чэрпаюць беларусы з багатай духоўнай спадчыны, якая дасталася нам ад продкаў. У нашай дашкольнай установе змалку вучаць дзяцей народным традыцыям і абрадам, нашай роднай мове, беларускім рамёствам. Давайце разам імкнуцца да таго, каб захаваць і перадаць нашым дзецям беларускую культуру, мову, рамёствы, нашу цудоўную краіну з яе прыродай і навучыць іх берагчы ўсе гэта.

Гучыць беларуская народная музыка, заходзяць дзеці.

Сённяшнюю сустрэчу мы прысвячаем нашай роднай Беларусі і пачынаем яе з галоўнай песні нашай краіны.

Дзеці выконваюць Гімн Рэспублікі Беларусь (музыка Н. Ф. Сакалоўскага, словы У. І. Карызны).

П е р ш ы  ў д з е л ь н і к
Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю.
У час світальны, вечаровы
Кажу пяшчоты цёплай словы.

Д р у г і  ў д з е л ь н і к
Дзень добры, сонейка над гаем!
Свяці ярчэй над родным краем,
Гукай вясну з зямной далечы.

Т р э ц і  ў д з е л ь н і к
Вітанне шлю, марозны вечар!
Ты запалі ў нябёсах зоркі.
Няхай збяруцца на вячоркі,
Чаруюць нас красой нязводнай.

Ч а ц в ё р т ы  ў д з е л ь н і к. Я гавару на мове роднай.

В я д у ч ы. Сабраліся мы сёння, каб пагаварыць пра беларускі вышыты ручнік. Для беларуса — гэта вельмі неабходная рэч. Як і раней, ручнік абавязкова прысутнічае падчас найбольш важных, пераломных этапаў жыццёвага шляху чалавека. Мы бачым яго там, дзе святкуюцца радзіны і вяселле, сустракаем яго і на праводзінах чалавека ў апошнюю дарогу. Традыцыя прадугледжвала выкарыстанне ручніка амаль ва ўсіх значных абрадах і звычаях. Просты, звычайны ручнік пераўтвараецца то ў вясельны падножнік, то ў падарунак, то ў магічную рэч, здольную адхіліць ліха і смерць. У ім адчуваецца подых аддаленых эпох, свядомасць і звычаі колішніх пакаленняў. Спакон вякоў на беларускай зямлі гасцей сустракаюць хлебам-соллю, якія падносяць з паклонам на ручніку. Паглядзіце, як гэта адбываецца *(падае дзецям).*

Х л о п ч ы к
На ручніках, расшытых пеўнямі,
Хлеб-соль падносім для гасцей.

Вядзём за стол, каўшамі пеннымі
Частуем квасам пагусцей.

Дзяўчынка
Я звычай маці сваёй зберагаю,
Усіх гасцей хлебам-соллю вітаю.
Кожны з вас будзе ўсмешкай сагрэт,
Калі ласка, прыміце наш хлеб.

Вядучы. А на вяселлі без ручніка ну проста немагчыма абысціся. Калі хлопец пакахаў дзяўчыну ды думае жаніцца, то ён пасылае да бацькоў нявесты сватоў. А сваты ідуць і бяруць з сабою хлеб, загорнуты ў ручнік. Глядзіце, як гэта адбываецца.

Сваха і сват выходзяць і паказваюць, што яны «ідуць у сваты». Адна з дзяўчынак разам з маці сустракаюць іх.

Сват. Добры дзень вам, добрыя людзі.

Маці. Дзень добры, праходзьце, сядайце.

Вядучы. Але сваты не мелі права садзіцца, пакуль не атрымаюць згоду нявесты выйсці замуж за хлопца.

Сваха. Дзякуй, пастаім. Ногі не баляць.

Сват. Вось ішлі мы каля вашай пшаніцы — бачым сляды. Звер — не звер, куніца — не куніца, а наш хлопец гаворыць — красна дзявіца.

Сваха. Хочам убачыць яе і паймаць.

Маці. Ёсць у нас дачка, ды яна яшчэ маладая. Няхай гадок-другі пагуляе.

Сват. Вось мы і прыйшлі па гэту кветку, што цвіце зімой і ўлетку.

Маці. Рана замуж ёй, яшчэ ўправіцца. Калі добра будзе — нажывецца, а як што не так, то паспее наплакацца.

Сват кладзе хлеб на стол.

Сваха. Мы прысланы, каб быў стол засланы.

Маці. Ну што ж, хлопец нам падабаецца. Засцілай, дачка, стол. Няхай людзі садзяцца.

**В я д у ч ы.** У знак згоды на шлюб маладая абвязвае свата ручніком *(паказваюць).* Затым пачыналі рыхтаваць маладую да вяселля — расплыталі косы, прычэсвалі, прыбіралі ў вэлюм і спявалі вясельныя абрадавыя песні.

Гучыць беларуская народная песня «Сівы конь».

**В я д у ч ы.** У гэты час малады з сябрамі, якіх называюць «дружынаю», збіраюцца ехаць па маладую.

Гучыць беларуская народная песня «Сыпце пшаніцу».

**В я д у ч ы.** А вянчалі маладых таксама на ручніку, які называлі «падножнік».

Дзве дзяўчынкі-дружкі сцелюць ручнік.

П е р ш а я  д з я ў ч ы н к а
Пахілілася бела бярозка
Да самай зямлі.

Д р у г а я  д з я ў ч ы н к а
Пакланілася маладая Ганулька
Усёй радні.

М а л а д а я
Ручнічок сабе рыхтавала,
З любоўю і пяшчотай яго вышывала.
Аб шчаслівай мару долі,
Каб не знаць гора ніколі.

Маладая становіцца з маладым на ручнік.

**В я д у ч ы.** Адыходзячы з жаніхом пасля вянчання, маладая стараецца пацягнуць ручнік нагою, а робіць гэта яна для таго, каб яе сяброўкі «цягнуліся» за ёю, таксама выходзілі замуж. І за вясельны стол вядуць маладых, звязаўшы іх рукі ручніком. Лічыцца, што так маладую сям'ю ручнік зберажэ ад

ліха ды бяды. Камандуе вяселлем сват. А са свата жартуюць, патрабуюць пачастункаў.

Гучыць беларуская народная песня «Прыйшоў на вяселле наш сватою».

А яшчэ на вяселлі ручнікі дораць новым сваякам і родным. І гуляе вяселле, песні не змаўкаюць. Ды яшчэ якія!

Выконваецца беларуская народная песня «Ты ж мяне падманула».

В я д у ч ы. А танцы? Ні адно вяселле не абходзіцца без «Кракавяка».

Выконваецца танец «Кракавяк».

В я д у ч ы. Пры святкаванні радзін-хрысцін ручнік карыстаецца асаблівай павагай. Гэта звязана са старажытнымі ўяўленнямі аб яго магічна-ахоўнай сіле. Павер'е ёсць такое: каб дзіця было прыгожым і здаровым, яго трэба спавіваць пасля першага купання самым прыгожым ручніком, які вышыла маці. А купала дзіця бабуля. І адбывалася гэта прыкладна так *(паказвае).* А маці дзякуе бабулі, дорыць ей ручнік *(паказвае).*

М а ц і. Дзякуй, бабуля, што дапамаглі. Няхай Вам Гасподзь Вашу працу верне.

В я д у ч ы. З ручніка, доўгага і шырокага, можна зрабіць люльку *(паказвае).* Гойдаецца паціху калыска, а маці калыханку спявае ды працу не забывае — шые альбо вышывае.

Гучыць песня «Калыханка».

Ну што? Бачыце, колькі трэба ручнікоў мець дзяўчыне? Дык не будзем час марнаваць бавіць, пачнём вышываць, сабе пасаг рыхтаваць.

Дзяўчынкі вышываюць, гучыць песня «Ручнікі».

Хутка ідуць гады, растуць дзеці, і не паспеюць мамы і таты азірнуцца, як вырастуць дзяўчынкі. Спатрэбяцца ім тады

ручнікі. І пачатак ужо зроблены. У нашых дзяўчынак ёсць першы ручнічок. Пакажыце іх усім.

Выконваецца танец з ручнікамі, музыка народная.

У даўнія часы, а можа, і не зусім даўнія (у час маладосці вашых бабуль), моладзь збіралася доўгімі зімовымі вечарамі на вячоркі, дзе дзяўчаты пралі і вышывалі, рыхтавалі сабе пасаг. А дзе дзяўчаты, там, вядома, і хлопцы. Ну, а якія могуць быць вячоркі без музыкі? Мы таксама хочам вас здзівіць вясёлым аркестрам, парадаваць беларускай музыкай.

Гучыць музычны нумар у выкананні шумавога аркестра «Лявоніха».

А яшчэ ў нас ёсць для вас, шаноўныя госці, сюрпрыз. Харэаграфічная студыя «Вяночак» прадстаўляе свой першы танец — «Полька-Янка»! Сустракайце юных артыстаў! А з музычным суправаджэннем ізноў шумавы аркестр!

Дзеці танцуюць «Польку-Янку».

Наша сустрэча падыходзіць да завяршэння, але няхай ніколі не скончыцца беларуская дабрата ды павага, працаздольнасць ды таленавітасць.

Няхай нам часценька
Шанцуе на госці.
Ніхто каб ніколі
Не меў на нас злосці.
Не мінайце нашай хаты,
Прыязджайце вы да нас.
Пірагамі мы заўсёды
Пачастуем, госці, вас.

Пад музыку д з е ц і выходзяць.

## *Заключэнне*

Выхаванне патрыятызму ў дзяцей дашкольнага ўзросту — гэта выхаванне станоўчых адносін дзяцей да гісторыі і сучаснасці роднага краю, да людзей, да культуры і звычаяў, да сваёй Радзімы.

Дасягненне высокага ўзроўню ў выхаванні патрыятызму становіцца магчымым пры стварэнні вызначаных умоў, да якіх адносіцца, у першую чаргу, прафесійная кампетэнтнасць педагога па арганізацыі адукацыйнага працэсу. Прафесійная кампетэнтнасць педагога прадугледжвае сфарміраваныя каштоўнасныя арыентацыі, высокі ўзровень валодання тэарэтычнымі ведамі, сфарміраванасць практычных уменняў, здольнасць паступова ўводзіць дзяцей у шматгранны і разнастайны навакольны свет з мэтай фарміравання цэласнага вобразу свайго роднага краю.

Высокі ўзровень прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў установы дашкольнай адукацыі дазволіць мэтанакіравана і паслядоўна ажыццяўляць адукацыйны працэс па патрыятычнаму выхаванню, вынікам якога павінны стаць:

- сфарміраванасць ў дзяцей ведаў аб родным краі;
- станоўчыя адносіны да навакольнага асяроддзя, інтарэс, эмацыянальны водгук на знешняе акружэнне, патрэба ўдзельнічаць у даступных падзеях, святах, у стваральнай прадуктыўнай працы;
- удзел у даступнай узросту патрыятычнай дзейнасці (гульні, святы, мастацкая дзейнасць).

Каштоўнасныя адносіны педагога да сваёй працы, да асобы дзіцяці актывізуюць сацыяльную пазіцыю ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу, узбагачаюць іх шкалу каштоўнасцей і маральнасць, што дазваляе сфарміраваць у дзяцей высокамаральныя якасці асобы: актыўнасць, самастойнасць, беражлівасць і адказнасць за навакольнае асяроддзе і прыроду, гордасць за сваю краіну і яе дасягненні.

ДАДАТАК А

# СЕМІНАР ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ
# ЭТАПЫ, ФОРМЫ І МЕТАДЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Распрацавала І. А. Юхнік, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці.

*Мэта:* абагульненне ведаў педагогаў пра этапы патрыятычнага выхавання, формы і метады працы з выхаванцамі.

*Форма правядзення:* круглы стол.

*Папярэдняя праца:* вызначэнне пытанняў для абмеркавання, вывучэнне педагогамі метадычных крыніц і педагагічнай перыёдыкі, аналіз адукацыйнай працы па патрыятычным выхаванні ва ўзроставых групах (аналіз планаў, прадуктаў дзейнасці дзяцей, прадметна-развіваючага асяроддзя, падрыхтоўка метадычных рэкамендацый для педагогаў).

## План семінара

1. Тэмы для абмеркавання:
   - Што такое патрыятызм?
   - Этапы патрыятычнага выхавання дашкольнікаў.
   - Галоўная задача азнаямлення дашкольнікаў з родным краем.
   - З якога ўзросту мэтазгодна знаёміць дзяцей з сімволікай краіны?
   - Метады і формы працы, якія выкарыстоўваюцца для фарміравання патрыятызму ў дашкольнікаў.
2. Справаздача педагогаў пра дзейнасць па патрыятычным выхаванні.
3. Абмеркаванне і складанне прыкладнага перспектыўнага плана па патрыятычным выхаванні дзяцей.
4. Распрацоўка метадычных рэкамендацый (дадатак А.1).

ДАДАТАК А.1

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

*Мэта:* фарміраванне маральнага стаўлення і пачуцця павагі да сям'і, горада, краіны; да прыроды роднага краю; да культурнай спадчыны свайго народа; выхаванне пачуцця асабістай годнасці ў дзіцяці як прадстаўніка свайго народа; талерантнасці.

Асаблівасцямі праяўлення патрыятычных пачуццяў у дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца сітуатыўнасць і хуткая ўспрымальнасць.

Дзіця можа ўсхваляваць толькі што пачуты аповед пра гераічны ўчынак, але затым на гэтыя ўражанні накладваюцца іншыя, і першае пачуццё, якое ўзнікла ў дзіцяці, можа згаснуць. Таму, як адзначаюць псіхолагі, неабходна замацаваць гэтыя эмоцыі ў шматразовых перажываннях, адмыслова ствараючы разнастайныя сітуацыі.

Перадаючы дзецям веды, неабходна ўлічваць, што яны павінны мець выхаваўчую каштоўнасць, спрыяць фарміраванню маральных пачуццяў. Важна памятаць, што светапогляд педагога, яго асабісты прыклад, погляды, меркаванні, актыўная жыццёвая пазіцыя — найбольш дзейсныя фактары выхавання.

Падчас працы па патрыятычным выхаванні дашкольнікаў вырашаюцца наступныя задачы:

1) *эстэтычнае і маральнае выхаванне.* Самае істотнае ў выхаванні маральных пачуццяў — гэта непасрэднае праяўленне іх у рэальных практычных учынках.

Дзейснае стаўленне да навакольнага свету праяўляецца ў гульні, у працы, у мастацка-выяўленчай дзейнасці, у зносінах з дарослымі і аднагодкамі, у паўсядзённым жыцці;

2) *фізічнае выхаванне.* Развіццё фізічных якасцей, спрыту (асабліва ў спартыўных гульнях з ваенна-патрыятычным зместам);

3) *працоўнае выхаванне.* Заахвочванне дзяцей да працоўнай дзейнасці, у аснове якой ляжыць жаданне зрабіць штосьці для іншых. Працу з грамадскай матывацыяй неабходна арганізоўваць як у дзіцячым садзе, так і дома, прычым сістэматычна, а не час ад часу. Праца дашкольніка нескладаная, аднак яна неабходна для фарміравання яго асобы.

Дарослыя павінны прывучаць дзяцей добрасумленна адносіцца да любой працы, дасягаць пастаўленай мэты. Неабходна выхоўваць у дашкольнікаў беражлівыя адносіны да грамадскай маёмасці, прыроды роднага краю. Каб дзіця зразумела значэнне вынікаў працы, яму трэба не толькі расказваць пра значнасць працы, але і паказваць, напрыклад, як вырасціць хлеб. Але яшчэ ў большай ступені ён усвядоміць неабходнасць паважлівых адносін да хлеба, калі вырасціць яго сам;

4) *фарміраванне беражлівых адносін да прыроды.* Важна, каб выхаванне гэтага пачуцця (догляд жывёл, праца на агародзе, абарона птушак зімой, вырошчванне кветак, гародніны і г. д.) спалучалася з выхаваннем любові да роднага пасёлка, з жаданнем удзельнічаць разам з дарослымі ў яго добраўпарадкаванні (азеляненне, уборка вуліц).

Рэкамендуемыя метады працы:

- мэтавыя прагулкі і экскурсіі;
- назіранні (напрыклад, назіранні за працоўным жыццём людзей, зменамі ў выглядзе пасёлка, вуліцы і г. д.);
- аповед і тлумачэнні педагога ў спалучэнні з паказам аб'екту і назіраннямі дзяцей за ім;
- гутаркі пра мясцовасць, у якой жывуць дзеці;

- выкарыстанне ілюстрацый, прэзентацый, наведванне музеяў;
- вывучэнне песень, вершаў, прыказак, прымавак аб Радзіме, чытанне казак, праслухоўванне музычных твораў;
- азнаямленне з вырабамі народнай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: саломапляценне, вырабы з гліны і г. д.;
- узбагачэнне і стымуляванне дзіцячай творчасці;
- прыцягненне дзяцей да пасільнай грамадска-карыснай працы;
- заахвочванне ініцыятывы і імкнення дзяцей самастойна падтрымліваць парадак у бліжэйшым асяроддзі, беражліва адносіцца да грамадскай маёмасці;
- добрасумленнае выкананне даручэнняў, выхаванне добрых паводзін у грамадскіх месцах;
- гутаркі з дашкольнікамі пра подзвігі суайчыннікаў, выхаванне павагі да ветэранаў вайны і працы;
- правядзенне тэматычных свят, ранішнікаў з запрашэннем ветэранаў вайны, герояў працы.

## Мадэль фарміравання патрыятычных пачуццяў



ДАДАТАК В

## ПРАГРАМА РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТУ

| Работа з педагогамі | Работа з дзецьмі | Работа з бацькамі |
| --- | --- | --- |
| – Практычны семінар «Распрацоўка гульняў»: «Вывучай свой край»;<br>– практычны семінар па навучанню вышыўцы «беларускі крыжыкам» на канве.<br>– вышыўка і пашыў кашулек у народным стылі для выступленняў;<br>– практычны семінар «Навучанне танцу "Кругавая кадрыля"» | – Арганізаваная і самастойная дзейнасць дзяцей;<br>– навучанне дзяўчынак старэйшай групы «Аксамітка» вышыўцы «беларускім крыжыкам» на тканіне і вышыўцы ручнікоў;<br>– навучанне хлопчыкаў старэйшай групы «Аксамітка» вышыўцы «беларускім крыжыкам» на кардоне;<br>– навучанне дзяцей усіх узроставых груп дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці (пляценне і аплікацыя з саломкі, лепка з гліны, выраб цацак з льну);<br>– выставы работ дзяцей;<br>– пастаянная дзейнасць фотавыставы «Вывучай свой край» (Баранавічы, Мінск, Мірскі замак, Нясвіжскі замак, Нацыянальная бібліятэка і г. д.);<br>– падрыхтоўка і правядзенне інтэлектуальнай гульні «Што? Дзе? Калі?» па тэме «Родныя краявіды» (старэйшая група);<br>– падрыхтоўка і правядзенне выніковых мерапрыемстваў ва ўсіх узроставых групах;<br>– заключнае свята-фестываль «Танцы беларускія» | – Анкетаванне;<br>– практычны семінар «Навучанне танцам "Кракавяк" і "Беларуская полечка"»;<br>– тэарытычна-практычны семінар «Беларускі ручнік: прыёмы аздаблення вырабу»;<br>– кансультацыі для бацькоў |

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Козлова, С. А.* Воспитание патриотических чувств / С. А. Козлова // Воспитание нравственных чувств у старших дошкольников ; под ред. А. М. Виноградовой. — М. : Просвещение,1980. — С. 45—74.
2. *Козлова, С. А.* Нравственное воспитание дошкольников в процессе ознакомления с окружающим миром : моногр. / С. А. Козлова ; АПН СССР, НИИ дошк. воспитания. — М. : Педагогика, 1988.
3. *Никонова, Л. Е.* Патриотическое воспитание детей старшего дошкольного возраста : пособие для педагогов / Л. Е. Никонова. — Минск : Нар. асвета, 1991. — 112 с.
4. *Чеушева, А. В.* Сущность и содержательная специфика патриотизма / А. В. Чеушева // Адукацыя і выхаванне.— 2004. — № 1. — С. 47—51.


## Спіс рэкамендаваных крыніц


1. Зямля з блакітнымі вачыма : дапам. для педагогаў дашк. устаноў / Р. А. Александровіч [і інш]. — Мн. : [б. в.], 2001.
2. *Варюхина, С. И.* Истоки доброты : пособие для педагогов / С. И. Варюхина. — Минск : Полымя,1987. — 128 с.
3. Мой край завецца Беларуссю: дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / аўт.-уклад. А. І. Красіла. — Мазыр : [б. в.], 2004.
4. Мой родны кут... : зб. метад. матэрыялаў па патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту : у 2 ч. / склад. В. В. Мініна. — Мазыр : Белы Вецер, 2007. — Ч. 1.
5. На мове бацькоўскай зямлі : дапам. для педагогаў дашк. устаноў / аўт.-уклад. А. І. Красіла. — Мазыр : Белы Вецер, 2003.
6. *Петрикевич, А. А.* Метод проектов в образовании дошкольников : пособие для педагогов учреждений, обеспечивающих получение дошк. образования. — Мозырь : [б. и.], 2008.
7. Пралеска : праграма дашкольнай адукацыі / Л. А. Панько [і інш.]. — Мн. : [б. в.], 2007.
8. Спадчына маёй краіны : матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі : у 2 ч. / склад. І. К. Грышкевіч. — 2-е выд. — Мазыр : [б. в.], 2006.

## ЗМЕСТ


*Чытачу* ........ 3
*Уводзіны* ........ 4

Раздзел 1 **Тэарэтычныя асновы патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту** ........ 5
Раздзел 2 **Арганізацыя дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі па патрыятычнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту** ........ 12
2.1 Накірункі педагагічнай дзейнасці па фарміраванню асноў патрыятызму ў дашкольнікаў ........ 14
2.2 Фарміраванне асноў патрыятызму ў дзяцей праз праект «Фестывалі беларускай культуры» ........ 16
Сцэнарый фестывалю **Танцы беларускія** ........ 17
Фрагмент тэарэтычна-практычнага семінара **Беларускія ручнікі ў народных абрадах і звычаях** ........ 21
Свята **Вячоркі ў цёткі Васіліны** ........ 23
Музычна-тэатральнае свята **Зямля з блакітнымі вачыма** ........ 26
Музычна-тэатральнае прадстаўленне **Мой родны кут, мая зямля** ........ 34
Інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?» **Беларусь — зялёная краіна** ........ 40
**Фальклорнае свята Ручнічок сабе рыхтавала** ........ 43

*Заключэнне* ........ 49

Дадатак А Семінар для педагогаў **Этапы, формы і метады патрыятычнага выхавання** ........ 50
Дадатак А.1 **Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі патрыятычнага выхавання дашкольнікаў на сучасным этапе** ........ 50
Дадатак Б **Мадэль фарміравання патрыятычных пачуццяў** ........ 53
Дадатак В **Праграма рэалізацыі праекту** ........ 54

Спіс выкарыстаных крыніц ........ 55
Спіс рэкамендуемых крыніц ........ 55

*Вытворча-практычнае выданне*

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ (З ВОПЫТУ РАБОТЫ)

**Практычнае кіраўніцтва для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі**

Складальнікі: *С. В. Кандрацюк, І. С. Маруцік*

Вядучы рэдактар *А. Г. Хахол*

Карэктар *С. А. Беразнюк*
Камп'ютарная вёрстка *В. В. Кукраш*

Падпісана ў друк 30.03.2013.
Фармат 60 × 84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Аддрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 3,49. Ул.-выд. арк. 2,00.
Заказ 62. Тыраж 65 экз.

ЛВ 02330/0552803 ад 09.02.2010

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт»,
225404, г. Баранавічы, вул. Войкава, 21.